## Беларуская мова

### Інструкцыя па выкананні экзаменацыйнай работы

Экзаменацыйная работа змяшчае 10 заданняў. На выкананне ўсіх заданняў адводзіцца 120 мінут. Заданні рэкамендуецца выконваць па парадку. Калі якое-небудзь з іх падасца цяжкім, пераходзьце да наступнага. Пасля выканання ўсіх заданняў вярніцеся да прапушчаных.

Жадаем поспеху!

1

**Заданне 1**

**Запішыце нумары слоў, у якіх вымаўленне супадае з напісаннем.**

1) дарожка; 2) дзень; 3) горад; 4) яблык.

Адказ:

2

**Заданне 2**

**Запішыце нумары правільных сцверджанняў.**

1) Сінтаксіс – гэта раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца правілы пастаноўкі знакаў прыпынку.

2) Прыстаўка, корань, суфікс і канчатак – марфемы.

3) Дзеяслоў – гэта самастойная часціна мовы, якая абазначае дзеянне і адказвае на пытанні ш т о  р а б і ц ь ? ш т о  з р а б і ц ь ?

4) Па мэце выказвання сказы дзеляцца на апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя, клічныя і няклічныя.

Адказ:

1

**Заданне 3**

**3.1. Запішыце нумары слоў, у якіх на месцы пропуску трэба ўставіць літару *а*.**

1) прынт__р;
2) гл__ток;
3) ш__птаць;
4) ч__мпіён.

Адказ:

1

**3.2. Запішыце нумары слоў, у якіх на месцы пропуску трэба ўставіць літару *я*.**

1) в__сковы;
2) л__генда;
3) тыс__ча;
4) вым__рзнуць.

Адказ:

**3.3. Запішыце нумары слоў, у якіх выдзеленая літара ўжыта правільна.**

1) прозьба; 3) ругзак;
2) загадчык; 4) зжаць.

Адказ:

**Заданне 4.**

**4.1. Запішыце словазлучэнні па-беларуску.**

1) ходить по кабинетам; 2) заболеть ангиной.

Адказ: 1)
2)

**4.2. Знайдзіце ў словазлучэннях граматычныя памылкі. Запішыце правільныя варыянты.**

1) даражэйшы ўсяго ў жыцці; 2) забегчы за кнігай.

Адказ: 1)
2)

**Заданне 5**

*Прачытайце тэкст і выканайце заданні да яго.*

(1) У верасні сады і лясы мяняюць паступова сваю летнюю зялёную вопратку на featuringрознакаляровае ўбранне. (2) Даўно ўжо няма звонкагалосага салаўя, па каменні каля рэчкі не скачуць жвавыя плiскі. (3) Апошнімі адлятаюць на поўдзень вадаплаўныя птушкі. (4) Рыбы збіраюцца ў (*чароды, ста́ткі, згра́і*) і шукаюць глыбокія мясціны. (5) Толькі шчупак па-ранейшаму палюе ў адзіночку, але і ён ідзе ў глыб вадаёмаў.

**5.1. Знайдзіце ў сказе (1) сінонімы і запішыце іх у той форме, у якой яны ўжыты ў тэксце.**

Адказ:

**5.2. Знайдзіце ў тэксце антонім да слоў *павольны, марудны* і запішыце яго ў той форме, у якой ён ужыты.**

Адказ:

**5.3. Выберыце ў сказе (4) са слоў, запісаных у дужках, тое, якое павінна быць ужыта па сэнсе. Запішыце гэта слова.**

Адказ:

**Заданне 6**

**6.1. Запішыце нумары назоўнікаў, якія ў форме меснага склону адзіночнага ліку маюць канчатак *-е*.**

1) машына;
2) хвоя;
3) падлога;
4) бібліятэка.

Адказ:

**6.2. Раскрыйце дужкі. Запішыце нумары словазлучэнняў, у якіх назоўнікі маюць канчатак *-у*.**

1) з шырокага (*лоб*);
2) выехаць з (*Брэст*);
3) ад невыноснага (*холад*);
4) ад разагрэтага (*асфальт*).

Адказ:

**6.3. Запішыце нумары словазлучэнняў, у якіх назоўнікі ўжыты з правільнымі канчаткамі.**

1) адпачываць на мор**ы**;
2) у чыстым пол**е**;
3) на высокім дуб**е**;
4) пры гэтым чалавек**е**.

Адказ:

**Заданне 7**

**7.1. Выберыце з займеннікаў, запісаных у дужках, той, які павінен быць ужыты, і запішыце яго.**

1) думаць пра (*табе, цябе*);
2) не пазна́ю (*сабе, сябе*);
3) дзякаваць (*сабе, сябе*);
4) дапамагу (*табе, цябе*).

Адказ: 1)
2)
3)
4)

**7.2. Раскрыйце дужкі і запішыце два колькасна-іменныя спалучэнні ў неабходнай склонавай форме: спачатку з колькасным лічэбнікам, пасля з парадкавым. Лічэбнікі пішыце словамі.**

На 478 (старонка).

Адказ:

**7.3. Знайдзіце прыметнікі, у напісанні якіх дапушчана памылка. Запішыце іх правільна.**

1) турыскі маршрут;
2) гарацкі парк;
3) Пухавіцкі раён;
4) французская мова.

Адказ:

**7.4. Запішыце словы, раскрываючы дужкі.**

1) (па) беларуску;
2) крыж (на) крыж;
3) (па) заўчора;
4) (на) ляту.

Адказ: 1) 2) 3) 4)

**Заданне 8**

**8.1. Запішыце кожны дзеяслоў у форме 2-й асобы цяперашняга часу адзіночнага ліку.**

1) мыць; 2) рэзаць; 3) заўважаць; 4) гнаць.

Адказ: 1) 2) 3) 4)

**8.2. Запішыце кожны дзеяслоў у форме 2-й асобы цяперашняга часу множнага ліку.**

1) мыць; 2) рэзаць; 3) заўважаць; 4) гнаць.

Адказ: 1) 2) 3) 4)

**Заданне 9**

**9.1. Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі словамі і іх роляй у сказе. Запішыце лічбы ў адпаведныя клеткі. Майце на ўвазе, што не ўсе лічбы могуць выкарыстоўвацца.**

| | | |
|---|---|---|
| **А.** | Для пошуку свайго месца ў жыцці нам даецца ***маладосць***. | **1.** Дзейнік |
| **Б.** | Ілья вылучаўся здольнасцю ***танцаваць***. | **2.** Выказнік |
| **В.** | Пажоўклае лісце ўжо напáдала ***ў крыніцу***. | **3.** Дапаўненне |
| **Г.** | Дно возера ***пакрыта*** тоўстым пластом водарасцей. | **4.** Азначэнне |
| | | **5.** Акалічнасць |

Адказ:

| А | | Б | | В | | Г | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|

**9.2. Пастаўце на месцы пропускаў, дзе неабходна, знакі прыпынку.**

*Як сведчаць крыніцы_ жыхары Івянца здаўна выраблялі бытавы посуд_ збаны_ міскі_ і кубкі_ і гандлявалі ім у розных краінах.*

**9.3. Запішыце нумары сказаў, у якіх на месцы пропуску неабходна паставіць працяжнік.**

1) Лес __ густы, стары.
2) Квяцісты май, ты __ дзіўны месяц!
3) Вышыня ратушы __ трыццаць два метры.
4) Стварыць добрае ўражанне __ першая ўмова паспяховага супрацоўніцтва.

Адказ:

**9.4. Запішыце нумары сказаў, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна.**

1) Павуціна на траве, нібы сівізна на скронях.
2) Нібы белы дымок, вісіць туман над рэчкай.
3) У снежным полі, быццам галодны воўк скуголіў вецер.
4) З садовых дрэў пасыпаліся пялёсткі, нібы сняжынкі.

Адказ:

**9.5. Устанавіце адпаведнасць паміж сказамі і ўмовамі адасаблення або неадасаблення выдзеленых членаў сказа. Запішыце лічбы ў адпаведныя клеткі. Майце на ўвазе, што не ўсе лічбы могуць выкарыстоўвацца.**

| | |
|---|---|
| **А.** **Пасаджаныя мінулай восенню** дрэўцы прыжыліся. | **1.** Азначэнне, выражанае дзеепрыметнікавым зваротам, якое стаіць пасля пояснёнага назоўніка, выдзяляецца коскамі. |
| **Б.** Сарокі пераляталі з дрэва на дрэва і надакучліва крычалі **адводзячы мяне ад гнязда**. | **2.** Развіты прыдатак, які стаіць пасля назоўніка, выдзяляецца коскамі. |
| **В.** Усю ноч і раніцу дождж ліў **не спыняючыся**. | **3.** Азначэнне, выражанае дзеепрыметнікавым зваротам, перад назоўнікам, які яно паясняе, не выдзяляецца коскамі. |
| **Г.** Лес **парослы сівым лішайнікам** выглядаў суровым і непрыветлівым. | **4.** Акалічнасць, выражаная адзіночным дзеепрыслоўем, не выдзяляецца коскамі, калі стаіць пасля дзеяслова-выказніка і сваім значэннем набліжаецца да прыслоўя спосабу дзеяння. |
| | **5.** Акалічнасць, выражаная дзеепрыслоўным зваротам, выдзяляецца на пісьме коскамі. |

Адказ:

| А | | Б | | В | | Г | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|

**Заданне 10**
**Прачытайце тэкст і выканайце заданні да яго.**

*Выконвайце заданне **10.1** у самім тэксце, заданні **10.2–10.6** – у спецыяльна адведзеных для адказу радках.*

(1) У прыродзе склалася так_ што жнівень сустракаецца з восенню. (2) **Карацейшымі** становяцца дні_ няма ўжо цёплага надвор'я_ не чуваць_ нават_ раніцай спеваў лясных птаствеаў_ нізіны і вадаёмы хавае туман. (3) Хоць ягад ужо няма_ але **жнівень** па-свойму багаты_ цёплыя_ кароткія дажджы спрыяюць росту грыбоў.

(4) У дружным карагодзе рассыпаюцца сярод моху лісічкі_ а на ўскрайку лесу чакае грыбніка чародка маладзенькіх казлякоў. (5) У змешаным лесе знойдзеш розныя сыраежкі_ адны грыбы ўжо набылі форму талерачак_ а іншыя толькі пачынаюць расці. (6) Вабяць грыбніка малады сасоннік_ і стары бор_ тут дружна растуць махавікі_ ды трапляюцца іншыя прадстаўнікі грыбнога царства. (7) Калі заўважыў вялікі грыб_ то прыглядайся_ бо абавязкова будуць і маленькія.

(8) Асабліва_ вабіць лес_ калі з'яўляюцца баравікі. (9) Грыбная пара працягваецца да глыбокай восені_ бо на змену баравікам **прыходзяць** іншыя грыбы.

**10.1. Пастаўце на месцы пропускаў, дзе неабходна, знакі прыпынку.**

**10.2. Знайдзіце ў сказе (2) граматычную памылку. Запішыце словазлучэнне правільна.**

Адказ:

**10.3. Утварыце ад слова *грыбнік* прыналежны прыметнік. Запішыце яго ў пачатковай форме.**

Адказ:

**10.4. Разбярыце па саставе выдзеленае ў сказе (9) слова *прыходзяць* (укажыце аснову і ўсе марфемы).**

Адказ:

**10.5. Ад выдзеленага ў сказе (3) слова *жнівень* ўтварыце прыставачна-суфіксальным спосабам прыслоўе і запішыце яго.**

Адказ:

**10.6. Запішыце выдзеленае ў сказе (2) слова *карацейшымі* ў пачатковай форме.**

Адказ:

**Беларуская мова**

**Інструкцыя па выкананні экзаменацыйнай работы**

**Заданне 1. Запішыце нумары слоў, якія пішуцца і вымаўляюцца аднолькава:**

1) лячыць; 2) беларускі; 3) пясчаны; 4) шчасце.

Адказ:______________________________________________

**Заданне 2. Запішыце нумары сказаў, дзе няма лексічных памылак:**

1) Красавік на дварэ. Пара рыхтавацца да дачнага сезону.
2) Нешырокая Бесядзь блакітнай стужкай пятляе між лугоў.
3) Першая прэм’ера купалаўскай “Паўлінкі” адбылася ў 1913 годзе.
4) Янка Купала – таленавіты геній, прызнаны далёка за межамі Беларусі.

Адказ:______________________________________________

**Заданне 3. Запішыце нумары правільных сцверджанняў:**

1) Назоўнікі 2-га скланення *дом, певень, салдат, парог* у чесным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-е***.
2) Ва ўсіх наступных прыкладах часціца ***не*** пішацца асобна: *(не) прыжыўся; (не) супраць памагчы; (не) даспелыя яшчэ плады; зусім (не) горшы*.
3) Назоўнікі 2-га скланення *дах, ранак, шум, цукар* у родным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-у***.
4) Ад прыметнікаў *добры, стары, мяккі, любімы* можа ўтварыцца ступень параўнання.
5) Дзве літары **нн** пішуцца ў прыметніках *абедзен_ы, стара́н_ы, бясцэн_ы, здаравен_ы*.
6) Прыслоўі *раз/пораз, па/суседску, калі/небудзь, па/кітайску* пішуцца праз злучок.

Адказ:______________________________________________

**Заданне 4. Прачытайце сказы. Знайдзіце словазлучэнні, у якіх парушаны граматычныя нормы беларускай літаратурнай мовы. Запішыце іх правільныя варыянты:**

1) Так і не справіўшыся з заданнем, **я пайшоў на дапамогу да бацькі.**
2) Гран-пры конкурсу атрымала **таленавіты малады архітэктар Аксана Яноўская.**
3) У верасні да нас прыйшло **чатыры новых вучня.**
4) Бульбы **засталося з паўтара кілаграма.**
5) У дыетычным харчаванні шмат страў **з рознай крупы.**

Адказ:______________________________________________

**Заданне 5. Запішыце выдзеленыя канструкцыі па-беларуску:**

1) **в десяти километрах** от города;
2) **моложе всех** коллег;
3) пройтись **по улицам** центра.

Адказ: 1)________________2)______________3)_______________

**Заданне 6. Выпішыце з кожнай групы лішняе слова:**

1) ш_снаццаць, дыспетч_р, гл_таць, ч_рцёж, ч_рнавокі;
2) дз_док, перас_ленцы, дзе_ч, марм_лад, св_ткаваць;
3) Пола_чына, ру_чнік, ма_чын, сма_ны, ноч_у;
4) снежан_скі, дз_ве, аген_чык, хрэс_біны, пяц_сот;
5) світан_е, праграм_а, суквец_е, Жан_а, разлад_е.

Адказ: 1)__________2)__________3)__________4)_________5)_________

**Заданне 7. Запішыце дзеясловы ў дужках у неабходнай па кантэксце <u>асабовай</u> форме, абазначце ў запісаных словах канчаткі:**

1) Чаго мы (хацець)?
2) Ці далёка вы (жыць)?
3) Адкуль гэта (ліцца)вада?
4) Дзе вы тут (мыцца)?

Адказ: 1)___________2)____________3)___________4)___________

**Заданне 8.**

**8.1. Раскрыйце дужкі і запішыце калькасна-іменныя спалучэнні словамі ў неабходнай склонавай форме.**

1) сабрацца з 74 (вучань); 2) без 896 (рубель);

Адказ: 1)__________________________2)_______________________

**8.2. Раскрыйце дужкі і запішыце два колькасна-іменныя спалучэнні словамі ў неабходнай склонавай форме: спачатку з колькасным лічэбнікам, пасля – з парадкавым:**

3) на 373 (старонка).

Адказ: 3)_____________________________________________________

**Заданне 9. Прачытайце сказ і выканайце заданні да яго.**

*Выконвайце пункт 1 задання ў запісаным ніжэй сказе, іншыя – у спецыяльна адведзенай для запісу вобласці адказу.*

Прыгледзеўшыся **ляснік**[1] заўважыў маленькія прыгожанькія як лісты канюшыны лісіныя сляды шчодра рассыпаныя **дзіўным узорам**[2] на вузкай сцяжынцы.

1) Пастаўце знакі прыпынку ў сказе.
2) Запішыце словазлучэнне пад нумарам **2** у форме роднага і меснага склонаў адзіночнага ліку.
3) Утварыце прыналежны прыметнік ад слова пад нумарам **1**, запішыце яго ў словазлучэнні з назоўнікамі сын, дачка.
4) Знайдзіце ў сказе назоўнік, з якім можа спалучацца лічэбнік ***двое***, і запішыце словазлучэнне "лічэбнік + назоўнік".

Адказ: 2)__________________3)_______________4)_______________

**Заданне 10. Прачытайце тэкст і выканайце заданні да яго.**

*Выконвайце пункт 1 задання ў запісаным ніжэй сказе, іншыя – у спецыяльна адведзенай для запісу вобласці адказу.*

(1) Мы беларусы як і кожны народ **любім**[1] родную зямлю сваю краіну ганарымся ёю і лічым што маем на гэта падставы.

(2) Разнастайная і прыгожая ў нас прырода блакітнымі стужкамі ўюцца вялікія і малыя рэкі сінеюць акаймаваныя лясістымі ўзгоркамі азёры **перашэптваюцца**[2] з ветрам стромкія бары і цяністыя дубровы шырока рассцілаюцца палеткі. (3) Нават балоцістыя абшары Палесся маюць нямала прыемнага для **вока**[3].

(4) Шматвяковая, багатая падзеямі гісторыя ў нашага народа. (5) Доўгі і складаны шлях праз многія гады барацьбы і пакут прайшоў наш народ, пакуль дабіўся волі і незалежнасці, атрымаў уласную дзяржаўнасць.

(6) Беларусь сёння славіцца здабыткамі, якіх ніколі раней не мела і **якія**[4] сталі магчымымі ў выніку стваральнай працы нашага народа.

(7) Бягуць у розных кірунках дарогі, злучаючы старажытныя і маладыя гарады, новабудоўлі, над якімі **ўзвышаюцца**[5] стрэлы вежавых кранаў.

1) Пастаўце знакі прыпынку ў сказах 1, 2.

2) Запішыце, якой часцінай мовы і якім членам сказа з'яўляецца слова пад нумарам **4**.

3) Разбярыце па саставе слова пад нумарам **5** (абазначце аснову і ўсе марфемы).

4) Ад дзеясловаў пад нумарамі **1, 2** утварыце і запішыце дзеепрыслоўі.

5) Са словам пад нумарам **3** запішыце фразеалагізм, які мае значэнне "крыху, нядоўга, імгненна" або "спадцішка, адначасова з чым-небудзь".

6) Вызначце стыль і асноўны тып тэксту.

Адказ: 1)_____________2)____________3)_____________4)_________________

5)_______________6) стыль тэксту: _______________ тып тэксту____________